УДК 070

А.В. Кананові́ч, асп.
(БДТУ, Мінск)

# СТРУКТУРА НУМАРА ГАЗЕТЫ “ПРЭСБОЛ” ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ СПАРТЫЎНАГА ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСІ Ў 1991 Г.

Газета ўяўляе сабой размяшчэнне асноўных раздзелаў і рубрык, сувязі паміж імі, а менавіта – супадпарадкаванасць, паслядоўнасць размяшчэння, парадак прытрымлівання асноўных раздзелаў і пастаянных рубрык газеты па нумарах у залежнасці ад іх значэння, актуальнасці і аператыўнасці; усталяванне адпаведных жанравых і іншых прапорцый у залежнасці ад тыпу выдання і яго традыцый [1].

Як сцвярджае Т.А. Сіліна-Ясінская, “у структуры газетнага нумара важна правільна размеркаваць рубрыкі па палосах. Звычайна галоўная інфармацыя размяшчаецца на першай паласе. Другая паласа часта развівае тэму першай. Для яе характэрны матэрыялы ў форме інтэрв’ю і нататак. Далей ідуць публікацыі аналітычнага характару. Завяршаюць нумар, як правіла, публікацыя забаўляльнага характару, літаратурныя старонкі, анекдоты і т.п.” [4, с. 35]

На працягу гадоў спорт застаецца з’явай шырокай і разнапланавай. Адпаведна, пры аналізе пытання аб культурным, палітычным, ідэалагічным і іншых значэннях спорту часта патрабуецца тлумачыць, які бок спорту як грамадскай з’явы разглядаецца і абмяркоўваецца.

У некаторых выданнях тэма можа лічыцца нязначнай. Аднак уплыў спартыўных газет і асобных спартыўных рубрык быў важным фактарам на фарміраванне светабачання насельніцтва.

На дадзены момант вопыт вывучэння спартыўнай журналістыкі невялікі. Асабліва гэта датычыцца першай незалежнай спартыўнай газеты “Прэсбол”.

Матэрыяламі даследавання сталі медыятэксты газеты “Прэсбол”, № 1–51, 1991 года колькасцю 1 178 публікацый.

Задача – устанавіць узаемасувязь структуры і зместу нумароў газеты за 1991 год з развіццём спартыўнай індустрыі Беларусі.

Навізна артыкула заключаецца ў правядзенні абагульненага аналізу матэрыялаў спартыўнай тэматыкі на прыкладзе газеты “Прэсбол” у 1991 годзе.

Дэмакратычным выданнем, якое пачало асвятляць спартыўныя мерапрыемствы ў час сувернітэту, стала газета «Пресс–бол» («Прэс–бол»). Першы нумар пабачыў свет 16 студзеня 1991 года. Развіццё выдання трапіла ў адзін з перыядаў “агульнай дэмакратызацыі

камунікацыйнага працэсу” [5, с. 376]. Як падкрэслівае прафесар А. Г. Слука, “другі этап – ліквідацыі монапартыўнай прэсы, дэмакратызацыі і бурнага развіцця беларускіх СМІ – пачаўся ў 1991 г. і працягваўся да 1996 г.” [5, с. 377].

За акрэслены год выйшаў 51 нумар з агульным тыражом больш за 6 мільёнаў экз. і сумарнай колькасцю 500 газетных палос. У сярэднім на паласе размяшчалася па тры матэрыялы – атрымліваецца за год больш за 1 500 тэкстаў.

У першым годзе назваў рубрык у выданні фармальна не існавала, аднак рэдакцыйная калегія фарміравала напаўненне палос у залежнасці ад значнасці падзей. Як сцвярджаў дацэнт У. К. Касько, рубрыкай з’яўляецца, у тым ліку, “4. Тэматычны раздзел (падраздзел) [6, с. 54].

У той жа час газета спрабавала прытрымлівацца паслядоўнага размяшчэння матэрыялаў па відах спорту. Пачыналіся нумары, як правіла, з матэрыялаў пра футбол – самым папулярным відзе спорту. У 1991 годзе праводзіўся апошні чемпіянат СССР па футболе, якому надавалася значная ўвага і пад аналіз матчаў мінскага “Дынама” адводзілася па 2–3 паласы (інтэрв’ю, рэпартажы, аналітычныя артыкулы).

Наступным па прыярытэтнасці былі еўрапейскія чэмпіянаты. Звязана гэта з тым, што беларускія і савецкія футбалісты сталі масава з’язжаць за мяжу, што тлумачылася палітычнамі абставінамі ў краіне і магчымасцю паспрабаваць сябе ў іншых першынствах. Падобныя матэрыялы з’яўляліся амаль у кожным нумары – ад пяці да васьмі.

Пазней пачалі з’яўляцца матэрыялы, перадрукаваныя з замежных СМІ (ЗША, ФРГ). Такіх за год было пяць.

Наступныя старонкі адводзіліся пад хакей – у часы СССР таксама прыярытэтны від спорту. У дадзеным выпадку рабіліся рэпартажы з матчаў “Дынама–Мінск” у чэмпіянаце. Суправаджаліся яны інтэрв’ю трэнераў, ігракоў, а таксама аналітычнымі артыкуламі.

Увага надавалася і іншым гульнявым відам спорту. У залежнасці ад значнасці спаборніцтваў і цікавых абставін матэрыялы пра гандбол ці баскетбол маглі размясціць не на апошніх палосах, а на першых. Напрыклад, рэпартаж пра першы тур чемпіяната СССР–91 па гандболе, размешчаны на трэцяй старонцы. Рэпартаж адлюстроўвае бытавыя ўмовы часоў перабудовы: *“В Астрахань, эту заповедно глухую российскую провинцию, всегда едешь с опаской. Предвкушаешь сдобренный тараканьими бегами гостиничный сервис, повергающие в тревогу за собственное здоровье услуги общепита, невозможность дозвониться домой и многое другое”*.

На першым развароце № 8 мы бачым інтэрв'ю з адной з вядомых беларускіх баскетбалістак Галіны Савіцкай, якая ў акрэслены час пераехала гуляць у Іспанію. Гэта быў аператыўны матэрыял пра першую баскетбалістку з прастораў СССР, якая паляцела гуляць на Захад з мінскай каманды. Адпаведна, тэкст падобнага маштабу і выцесніў футбол і хакей з першых палос.

Іншы яскравы прыклад. Другі нумар газеты на другой паласе пачаўся з шахмат. Справа ў тым, што ўпершыню беларускі шахматыст пачаў змагацца за "шахматную карону". У кантэксце пра гісторыю спартсмэнаў, якія вырашылі змяніць сваё жыццё, а ў 1991 годзе падобнае было актуальным, можна нават узгадаць матэрыялы пра прадстаўнікоў вадналыжнага спорту, фігурнага катання і г. д. Адным словам, на фоне абставінаў ствараліся адметныя матэрыялы.

Што датычыцца рэкламных тэкстаў, якія з'яўляліся адным са складнікаў структуры газетнага нумара, то ў 1991 годзе да № 23 пад рэкламу цалкам адводзілася восьмая паласа. Аднак з наступнага нумара колькасць рэкламы павялічылася ў два разы, што звязана з павелічэннем колькасці палос.

За 1991 г. у газеце "Прэсбол" былі надрукаваны артыкулы, прысвечаныя 28 відам спорту, сярод якіх лідарамі былі гульнявыя – футбол, хакей, гандбол, баскетбол.

– футбол – 648 (279 у першым паўгоддзі, 369 у другім паўгоддзі);

– хакей – 227 (78 у першым паўгоддзі, 149 у другім паўгоддзі);

– гандбол – 116 (39 у першым паўгоддзі, 77 у другім паўгоддзі);

– баскетбол – 86 (50 у першым паўгоддзі, 36 у другім паўгоддзі);

– валейбол – 13 (1 у першым паўгоддзі, 12 у другім паўгоддзі);

– лёгкая атлетыка – 13 (5 у першым паўгоддзі, 8 у другім паўгоддзі);

– спартыўная гімнастыка – 10 (9 у першым паўгоддзі, 1 у другім паўгоддзі);

– шахматы 9 (6 у першым паўгоддзі, 3у другім паўгоддзі);

– тэніс – 9 (2 у першым паўгоддзі, 7 у другім паўгоддзі);

– шашкі 6 (3 у першым паўгоддзі, 3 у другім паўгоддзі);

– каратэ, кігбоксінг, таэквандо, самба – 5 (4 у першым паўгоддзі, 1 у другім паўгоддзі);

– культурызм 3 (3 у першым паўгоддзі, 0 у другім паўгоддзі);

– цяжкая атлетыка – 3 (1 у першым паўгоддзі, 2 у другім паўгоддзі);

– хакей на траве – 2 (2 у першым паўгоддзі, 0 у другім паўгоддзі);

– плаванне – 2 (1 у першым паўгоддзі, 1 у другім паўгоддзі);

– парусны спорт – 2 (0 у першым паўгоддзі, 2 у другім паўгоддзі);

– мастацкая гімнастыка – 2 (1 у першым паўгоддзі, 1 у другім паўгоддзі);

– вольная барацьба – 1 (1 у першым паўгоддзі, 0 у другім паўгоддзі);

– фігурнае катанне – 1 (1 у першым паўгоддзі, 0 у другім паўгоддзі);

– акадэмічная грэбля – 1 (0 у першым паўгоддзі; 1 у другім паўгоддзі);

– водныя лыжы – 1 (0 у першым паўгоддзі; 1 у другім паўгоддзі);

– канькабежны спорт – 1 (1 у першым паўгоддзі, 0 у другім паўгоддзі);

– веласпорт – 1 (1 у першым паўгоддзі, 0 у другім паўгоддзі);

– лыжныя гонкі 1 (1 у першым паўгоддзі, 0 у другім паўгоддзі);

– бокс 1 (1 у першым паўгоддзі, 0 у другім паўгоддзі);

– грэбля спартыўная – 1 (0 у першым паўгоддзі, 1 у другім паўгоддзі);

– фехтаванне – 1 (0 у першым паўгоддзі, 1 у другім паўгоддзі);

– рэгбі – 1 (0 у першым паўгоддзі, 1 у другім паўгоддзі).

Было апублікавана 8 артыкулаў па праблемах развіцця міжнароднага спорту. Былі зафіксаваныя тры нататкі са спачуваннямі, тры артыкулы-вытрымкі навін з замежных СМІ.

Таксама было надрукавана 220 рэкламных абвестак (78 у першым паўгоддзі, 142 у другім паўгоддзі).

Такім чынам, у 1991 годзе газета “Прэсбол” імкнулася паказаць развіццё спорту ў краіне. На працягу 51 нумароў была прадстаўлена інфармацыя пра 28 дысцыплін, не скрываючы праблем у іх развіцці на суверэнным этапе. Статыстыка матэрыялаў засведчыла, што самыя папулярныя тэмы былі звязаныя з футболам, хакеем і баскетболам. Гэта можна патлумачыць тым, што каманды ўдзельнічалі ў апошнім першынстве СССР, адпаведна знаходзіліся на дзяржаўным забеспячэнні і за іх вынікамі сачыла кіраўніцтва краіны. Таксама матэрыялы пра іх выступленні мелі сярод чытачоў зацікаўленасць.

## ЛІТАРАТУРА

1. Структура и композиция периодического издания [Электронный ресурс] // lektsii.org. – Режим доступа : https://lektsii.org/5-51616.html. – Дата доступа : 23.12.2021.

2. Алексеев, К. А. Спортивная журналистика : учебник для магистров / К. А. Алексеев, С. Н. Ильченко. – М. : Юрайт, 2014. – 427 с.

3. Туленков, Д. А. Спортивная публицистика и спортивная журналистика: особенности специализированного направления / Д. А. Туленков // Журналистика. Молодые исследователи : Межвузовский сб. науч. раб. студентов и аспирантов. Вып. 3. – СПб., 2004. – С. 175.

4. Силина-Ясинская, Т. В. Выпуск учебной газеты : учеб.-метод. комплекс / Т. В. Силина-Ясинская [и др.] ; под общ. ред. О. М. Самусевич. – Минск : БГУ, 2019. – 182 с.

5. Слука, А. Г. Беларуская журналістыка : падручнік / А. Г. Слука. – Мінск : БДУ, 2011. – 447 с. – (Класічнае ўніверсітэцкае выданне).

6. Касько, У. К. Слоўнік выдавецкіх тэрмінаў / У. К. Касько. – Мінск : БДУ, 2012. – 130 с.

УДК 655.24

О.Г. Барашко, канд. техн. наук, доц.;
В.И. Куликович, канд. филолог. наук, доц.
(БГТУ, г. Минск)

## УЗКИЕ МЕСТА ПРИ СОЗДАНИИ И ИСПОЛЬЗОВАНИИ ВАРИАТИВЫХ ШРИФТОВ

Вариативный шрифт представляет собой один файл, разброс начертаний в котором ограничен только самой тонкой и жирной толщиной. Между ними можно самостоятельно выбрать любое понравившееся положение.

Технология вариативных шрифтов на самом деле не так уж нова. Adobe и Apple независимо друг от друга разработали мастер-шрифты Multiple Master и вариации GX-шрифтов ещё в начале 1990-х годов. Обе разработки представляли собой технологии управления осями, сродни современным вариативным шрифтам. К 2000 году Adobe отказалась от шрифтов Multiple Master, а поддержка технологии GX изначально была минимальной. Всё изменилось, когда Apple, Adobe, Microsoft, Google и несколько независимых бюро и студий шрифтового дизайна, включая Dalton Maag, собрались вместе и анонсировали, что OpenType Font Variations (более известные как вариативные шрифты) будут добавлены в спецификацию OpenType в середине 2016 года.

С тех пор были созданы сотни вариативных шрифтов: некоторые экспериментальные, дабы понять, на что способны технологии, а другие – высокофункциональные, с целью повысить веб-